Л. Дзямешка, С. Зыгмантовіч



Да 65-годдзя заснавання вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь

# Навукова-даследчая дзейнасць кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументных камунікацый

*Даследаваннем праблем бібліятэказнаўства і бібліятэчнай справы, навуковым асэнсаваннем значнасці бібліятэк для грамадскага развіцця і ролі грамадства ў развіцці бібліятэк займаецца калектыў кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (раней бібліятэказнаўства). На сучасны момант на кафедры працуюць 9 выкладчыкаў, у тым ліку 2 прафесары, 6 дацэнтаў, 1 старэйшы выкладчык. Як сумяшчальнікі на кафедру запрошаны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі доктар педагагічных навук, прафесар Р.С. Матульскі, вучоны сакратар гэтай жа бібліятэкі А.А. Капырына. Кафедра мае высокі навуковы цэнз: 90% выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі. Загадвае ёю кандыдат педагагічных навук, дацэнт С.В. Зыгмантовіч.*

Гістарычнае развіццё кафедры сведчыць аб разнастайнай, глыбокай і плённай навукова-даследчай дзейнасці. Кафедра была адкрыта ў 1944 г. пры Мінскім педагагічным інстытуце (зараз – Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка) і з'явілася заснавальніцай бібліятэчнага факультэта. Па-сутнасці, яна палажыла пачатак вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

З часу заснавання навукова-даследчая дзейнасць кафедры здзяйснялася ў межах гістарычнай перыядызацыі яе развіцця:

– арганізацыя і першапачатковае станаўленне (1944–1960 гг.);

– паступовае развіццё, якое вызначалася павелічэннем колькасці штатных выкладчыкаў і вылучэннем з яе складу другой кафедры – бібліяграфіі (1961–1974 гг.);

– набыццё новага статуса ў сувязі з адкрыццём Мінскага інстытута культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў (1975–2003 гг.);

– рэарганізацыя кафедры бібліятэказнаўства ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ў сувязі з рэарганізацыяй бібліятэчнага факультэта ў факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (з 2003 г.).

Кожны з гэтых этапаў адзначаны пэўнымі пошукамі і дасягненнямі, якія характарызуюцца ў тым ліку і паступовым развіццём і пашырэннем навукова-даследчай дзейнасці. Засяродзім на іх увагу.

Узначаліў кафедру і кіраваў ёю на працягу дзевяці гадоў выдатны бібліятэказнаўца і бібліёграф, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі) Іосіф Бенцыянавіч Сіманоўскі. Менавіта ён унёс неацанімы ўклад у бібліятэчнае будаўніцтва Беларусі, сфарміраваў падмурак кафедры, быў першым яе выкладчыкам і навукоўцам, меў вялікі аўтарытэт у бібліятэчным свеце, валодаў цудоўнымі арганізатарскімі здольнасцямі. Вядома, першапачатковай задачай было фарміраванне штата кафедры, таму з бібліятэчных інстытутаў Масквы і Ленінграда былі часова запрошаны выкладчыкі спецыяльных дысцыплін – дацэнты Л.А. Левін, А.А. Громава, ст. выкл. М.А. Дзічкоўская, а з Дзяржаўнай бібліятэкі БССР – вопытныя супрацоўнікі Н.Б. Ватацы, Н.В. Каляда, М.І. Масенжнік, А.П. Дземчанкава.

Паступова вызначыўся пастаянны штат выкладчыкаў. Спецыяльныя дысцыпліны, уведзеныя ў вучэбныя планы, – «Бібліятэчныя каталогі», «Работа з чытачамі», «Гісторыя бібліятэчнай справы», «Каталагізацыя», «Бібліяграфія» – патрабавалі метадычнага асэнсавання і забеспячэння.

Першыя публікацыі адносяцца да 50–60-х г. XX ст. і знаходзяць адлюстраванне на старонках расійскага часопіса «Библиотекарь», а таксама ў «Учёных записках» Мінскага педагагічнага інстытута; час ад часу яны з'яўляюцца ў зборніках матэрыялаў навуковых і навукова-практычных канферэнцый. Вялікі ўклад у даследаванне гісторыі бібліятэк унёс у гэты час І.Б. Сіманоўскі, які выступіў на навуковай канферэнцыі ў Маскве (1957) з дакладам «Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской революции» [1]. Гэта сапраўды сур'ёзная даследчая праца, у якой раскрыта гісторыя стварэння бібліятэк, іх дзейнасць у кантэксце трансфармацыі грамадства на працягу 40 гадоў савецкай улады. Вядома, праца мае ідэалагізаваны характар у рэаліях таго часу, тым не менш каштоўны фактаграфічны і статыстычны матэрыял з'явіўся першапачатковай крыніцай для наступных даследаванняў праблемы іншымі даследчыкамі і ў іншыя перыяды развіцця кафедры.

Навукова-даследчая дзейнасць кафедры набывае больш сістэматычны характар на другім этапе развіцця, які характарызуецца вылучэннем з яе складу кафедры бібліяграфіі; стабільна сфарміраваным штатам (В.А. Дукель, І.П. Емец, В.П. Іванова, Р.А. Кучур, А.Ф. Галуза, К.С. Верабей, Р.А. Ролева, К.Т. Маўрычава, Н.А. Ярохіна) і папаўненнем кадрамі з вучонымі ступенямі (В.Ф. Якіменка, Н.М. Калоска, М.І. Пакала). У гэты ж час з'явілася магчымасць рыхтаваць высокакваліфікаваных выкладчыкаў праз мэтавую аспірантуру інстытутаў культуры Масквы і Ленінграда. Першым выкладчыкам, скончыўшым мэтавую аспірантуру Маскоўскага інстытута культуры і абараніўшым кандыдацкую дысертацыю па

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», стала М.І. Пакала. Яе шматгадовая педагагічная дзейнасць на працягу 1958–1992 г. і даследчыя намаганні далі добры вынік: распрацаваны першыя вучэбныя праграмы па дысцыплінах «Бібліятэчныя фонды» і «Гісторыя бібліятэчнай справы ў БССР», а потым выдадзены аднайменныя падручнікі для студэнтаў [2].

Выкладчыкі кафедры атрымалі магчымасць публікаваць свае навуковыя працы на старонках міжведамаснага прафесійнага зборніка «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства», стварэнне якога адбылося па ініцыятыве М.Ц. Таўкачова (заг. кафедры з 1952 па 1961 год).

Забягаючы наперад, адзначым, што зборнік праіснаваў з 1972 па 1995 год. У складзе яго рэдкалегіі ў розныя гады працавалі выкладчыкі кафедры М.І. Пакала, В.Ф. Якіменка, Л.А. Дзямешка, Л.І. Казлоўская, Н.А. Ляйко, Н.У. Клімянкова. У 19 выпусках гэтага зборніка знайшлі адлюстраванне розныя праблемы беларускага бібліятэказнаўства, якое інтэнсіўна развівалася ў межах савецкага (а, дакладней, расійскага) бібліятэказнаўства, абапіраючыся і развіваючы яго лепшыя традыцыі, кірункі, арганізацыю і метадалогію. Вялікая колькасць навуковых прац прысвечана гісторыі бібліятэчнай справы, якая разглядалася ў кантэксце гісторыі краіны. Частка даследаванняў знайшла потым увасабленне ў абароненых кандыдацкіх дысертацыях [3].

Адначасова робяцца першыя крокі па даследаванні педагагічных асноў бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў. Каля 10 артыкулаў на старонках зборніка прысвечана праблемам чытання, выхавання розных чытацкіх груп, фарміравання чытацкіх інтарэсаў, развіцця методыкі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Матэрыялы знайшлі адлюстраванне ў абароненых кандыдацкіх дысертацыях [4]. Даследуюцца праблемы кадраў [5], стану і перспектыў удасканалення бібліятэчнай статыстыкі [6].

Выкладчыкі кафедры прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы, выданні, рэцэнзаванні 4-х манументальных даведнікаў «Бібліятэчная справа на Беларусі. Дакументы і матэрыялы» (1918–1941 гг.); (1941–1958 гг.); (1959–1975 гг.); (1976–1990 гг.), над якімі плённа працуе калектыў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (адказны рэдактар – намеснік дырэктара па навуковай рабоце Л.Г. Кірухіна, пастаянны член рэдкалегіі – загадчык аддзела бібліятэказнаўства В.А. Сабалеўская).

Навукова-даследчыя матэрыялы знаходзяць адлюстраванне ў падручніках, вучэбных і метадычных дапаможніках, праграмах, што спрыяе павышэнню якасці выкладання спецыяльных дысцыплін. Тым больш, што змястоўна мяняецца і падрыхтоўка спецыялістаў: з універсальнай, разлічанай у асноўным на патрэбы публічных бібліятэк, яна становіцца спецыялізаванай. За кафедрай замацоўваецца падрыхтоўка бібліятэкараў па спецыялізацыях «масавыя і навуковыя бібліятэкі» і «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі».

Трэці этап развіцця кафедры – самы вялікі па працягласці і надзвычай плённы. Ён звязаны з адкрыццём Мінскага інстытута культуры (1975), у сувязі з чым кафедра набывае новы статус: становіцца на факультэце вядучай і цесна супрацоўнічае з новымі кафедрамі – тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі, а крыху пазней з кафедрай дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі. На кафедру ў гэты перыяд прыходзяць маладыя выкладчыкі: У.А. Акуліч, Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, Н.А. Ляйко, С.А. Паўлава, Р.С. Матульскі, Н.В. Алянюк, якія паспяхова абараняюць дысертацыі ў аспірантуры Маскоўскага, Ленінградскага інстытутаў культуры, Мінскім педагагічным інстытуце. Працэнт выкладчыкаў з навуковымі ступенямі і званнямі дасягнуў 60, што дало магчымасць глыбока распрацоўваць праблемы бібліятэказнаўства, стымуляваць навукова-даследчую і вучэбную работу студэнтаў.

Яскрава акрэсліліся прадметна-метадычныя камісіі. Гісторыю бібліятэчнай справы паспяхова даследуюць кандыдаты гістарычных навук У.А. Акуліч, І.П. Емец, В.Ф. Якіменка, кандыдат педагагічных навук Н.М. Калоска. Пытанні чытачазнаўства знаходзяць адлюстраванне ў даследаваннях кандыдатаў філалагічных навук С.А. Паўлавай, Л.І. Пятровічавай. Праблемы каталагізацыі даследуюцца кандыдатамі гістарычных навук Н.А. Ляйко, педагагічных навук Л.І. Казлоўскай, выкладчыкам А.І. Фядорынай; пытанні фарміравання фондаў – кандыдатам педагагічных навук М.І. Пакала; арганізацыя бібліятэчнай справы – ст. выкладчыкамі І.М. Стрыжонак, Т.І. Чаплыгінай, Г.П. Сёмінай; абслугоўванне чытачоў – кандыдатамі педагагічных навук Л.А. Дзямешка, В.А. Дукель, Н.У. Клімянковай. Пашыраецца дыяпазон навуковых прац, выдаюцца манаграфіі: «Савецкі рабочы-чытач», «Савецкі селянін-чытач» (Л.І. Пятровічава), «Інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі» (Л.А. Дзямешка), «Роля бібліятэкі ПТУ ў прафесійным і духоўным станаўленні маладых рабочых» (Н.У. Клімянкова); дэпанаваны кафедральны манаграфічны зборнік «Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь: здабыткі і перспектывы» (2001 г.).

Навукова-даследчыя напрацоўкі спрыяюць метадычнаму забеспячэнню вучэбнай дзейнасці студэнтаў, выходзіць з друку шэраг вучэбна-метадычных матэрыялаў: вучэбны дапаможнік «Бібліятэчнае абслугоўванне» ў 3-х частках (Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, С.А. Паўлава; у І частцы сярод сааўтараў – дацэнт В.А. Дукель), «Бібліятэказнаўства: тэорыя бібліятэчнай справы» (Р.С. Матульскі), «Бібліятэчныя каталогі» (Н.А. Ляйко, Л.І. Казлоўская, Р.А. Ролева), «Бібліятэка і вольны час» (Л.А. Дзямешка), «Табліцы для дзіцячых і школьных бібліятэк: бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя» (Н.А. Ляйко, А.І. Фядорына), хрэстаматыя «Заканадаўчыя, рэгламентуючыя і статыстычныя матэрыялы па бібліятэчнай справе» (Р.С. Матульскі), даведнік «Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь» (Р.С. Матульскі).

У сувязі з прызнаннем беларускай мовы дзяржаўнай і пераходам на выкладанне прадметаў на беларускай мове, пашырэннем практыкі яе выкарыстання ў навучальным працэсе і практычнай дзейнасці бібліятэк вялікую дапамогу студэнтам і бібліятэкарам аказалі тэрміналагічныя слоўнікі па бібліятэказнаўстве і бібліяграфазнаўстве, упершыню распрацаваныя і выдадзеныя ў Беларусі (В.Е. Лявончыкаў, Л.А. Дзямешка, Р.І. Саматыя) [7]. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў (Мн., «Выш. школа», 2000) атрымаў І месца на Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац.

З адкрыццём аспірантуры па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» і Спецыялізаванага Савета па абароне дысертацый пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (1989 г.) кафедра актывізавала падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў. За час існавання Савета пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры абаранілі кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці «бібліятэка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаўства і бібліяграфія» аспіранткі Л.І. Ракавецкая на тэму «Тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнага менеджменту» (нав. кір. – дацэнт Л.І. Дзямешка); А.М. Багарэвіч «Інфармацыйныя патрэбнасці чытачоў як фактар фарміравання фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» (нав. кір. – дацэнт Н.У. Клімянкова); Н.Я. Петушка «Бібліятэчнае абслугоўванне інвалідаў па зроку: тэарэтыка-метадычны аспект», (нав. кір. – дацэнт У.А. Акуліч); Хаддад Набіль, Сірыя «Каталагізацыя дакументаў і асаблівасці яе развіцця і прымянення ў бібліятэках Сірыі» (нав. кір. – дацэнт Н.А. Ляйко); Салех Кайс, Сірыя «Універсітэцкая бібліятэка ў сістэме абслугоўвання навукова-даследчай і вучэбнай дзейнасці выкладчыкаў» (нав. кір. – дацэнт Н.У. Клімянкова).

З мэтай навуковага і вытворчага супрацоўніцтва кафедра заключае дагаворы і наладжвае кантакты з замежжам: Сафійскім і Вяліка-Тырнаўскім універсітэтамі (Балгарыя), Варшаўскім і Ягелонскім універсітэтамі, Вышэйшай педагагічнай школай Ольштына (Польшча), Вышэйшай школай бібліятэчнай і інфармацыйнай справы ў Штутгарце (Германія), Дагестанскім універсітэтам, ВНУ Нідэрландаў. Вынікамі супрацоўніцтва з'яўляецца выязная вытворча-азнаямляльная практыка студэнтаў у гэтыя краіны; стажыроўка выкладчыкаў у бібліятэках ВНУ замежжа; сумесныя міжнародныя канферэнцыі па праблемах агульных даследаванняў: «Польская кніга і чытач на Беларусі», «Беларуская кніга і чытач у Польшчы»; правядзенне лекцый ва універсітэтах замежных краін; шматлікія публікацыі ў замежным друку.

Пачынаючы з 1981 г. усе члены кафедры працуюць у межах кафедральных комплексных даследаванняў: **«Развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі (1981–1985 гг.)»**, **«Бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва Беларускай ССР (1986–1990)»**, **«Кніга і чытанне ў сістэме міжнацыянальных зносін (1991–1994 гг.)»**, **«Гісторыя і сучасны стан бібліятэчнай справы на Беларусі (1995–2000 гг.)»**, **«Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь і іх кадравага патэнцыялу (2001–2005 гг.)»**.

Праблематыка кафедральных даследаванняў і іх вынікі заслугоўваюць увагі. Актыўнымі ўдзельнікамі-распрацоўшчыкамі тэмы «Развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі» з'яўляліся Н.М. Калоска, М.І. Пакала, І.П. Емец, Т.Ц. Латоціна-Князева, А.Ф. Галуза, Р.А. Ролева, У.А. Акуліч, В.Ф. Якіменка, Н.А. Ляйко. Даследаванні па гісторыі бібліятэчнай справы ахопліваюць розныя перыяды існавання і развіцця бібліятэк у розных фармацыях – ад феадалізму (IV ст. – 1861 г.), капіталізму (1861–1917 гг.) да паслякастрычніцкага перыяду. Вынікі выкладаліся ў артыкулах айчыннага і расійскага друку. Званне кандыдата гістарычных навук атрымалі Акуліч У.А. (1982), Емец І.П. (1981), Ляйко Н.А. (1981).

У выніку даследавання наступнай кафедральнай тэмы – «Бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва Беларускай ССР» – вызначаны сацыяльная місія масавай бібліятэкі, яе функцыі і дзейнасць ва ўмовах палітычнага плюралізму, уплыў на духоўнае развіццё моладзі, развіццё і ўкараненне інавацыйных формаў і метадаў абслугоўвання насельніцтва, даследаваны пытанні культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэкі. Увага даследчыкаў звернута на абслугоўванне насельніцтва беларускай кнігай, прапаганду беларускай мовы.

У сувязі з актывізацыяй міжнацыянальных зносін сумесна з калегамі Варшаўскага універсітэта (Польшча) распрацавана методыка і падыходы да даследавання чытання польскай кнігі ў Беларусі і беларускай кнігі ў Польшчы. Матэрыялы апублікаваны ў Польшчы «Кніжка і чытачы ў этнічных групах» (штодзённік «Ніва», выданы Беластоцкім ваяводствам, 1990, 7 студзеня). Карпатлівая праца членаў кафедры дала магчымасць вылучыць гэты напрамак у самастойную тэму кафедральнага даследавання «Кніга і чытанне ў сістэме міжнацыянальных зносін» (1991–1994 гг.). Змены, якія адбываліся на той час у палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці рэспублікі, далі даследчыкам магчымасць вызначыць тэндэнцыю да павелічэння попыту на кнігі на нацыянальных мовах як устойлівую, а, значыць, і ролю бібліятэкі ва ўдасканаленні нацыянальных зносін – як неабходную.

Па выніках даследавання праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя ў Польшчы (Яблонна), на якой з дакладамі выступілі У.А. Акуліч, Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, Н.А. Ляйко [8].

З 1995 па 2000 г. за кафедрай замацавана тэма «Гісторыя і сучасны стан бібліятэчнай справы на Беларусі», па выніках вывучэння якой можна вылучыць наступныя напрацоўкі:

– вызначана сукупная сетка бібліятэк Рэспублікі Беларусь з пункту гледжання тыпалогіі (дац. Р.С. Матульскі);

– абгрунтавана неабходнасць новых спецыялізацый у падрыхтоўцы кадраў бібліятэчнай сферы ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу (дац. У.А. Акуліч);

– распрацаваны арганізацыйныя асновы навуковых даследаванняў у бібліятэцы з пазіцый сацыялогіі чытання (дац. Н.У. Клімянкова);

– вызначана прафілізацыя дзейнасці публічных бібліятэк па абслугоўванні карыстальнікаў, пашырэнне і разнастайнасць камунікатыўных паслуг (праф. Л.А. Дзямешка);

– высветлены агульныя і спецыфічныя заканамернасці міжасабовых чытацкіх стасункаў у працэсе абслугоўвання юнацтва (дац. С.А. Паўлава);

– вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці бібліятэк ва ўмовах рэформы школы, іх магчымасці ў дапамогу вучэбнаму і выхаваўчаму працэсу (дац. Н.А. Ляйко);

– ахарактарызаваны і сістэматызаваны накірункі дзейнасці Таварыстваў па выданні беларускай кнігі ў гістарычным аспекце (ст. выкл. Т.І. Чаплыгіна).

Такім чынам, у комплексным даследаванні знайшлі адлюстраванне праблемы, харатэрныя для таго часу: бібліятэчная сетка, кадры, бібліятэчная адукацыя, сацыялогія чытання ў кантэксце бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў, фарміраванне іміджу бібліятэкі напрыканцы XX ст. Уражвае і тое, што аб'ём даследчай работы адлюстраваны ў 48 апублікаваных крыніцах. Выніковая кафедральная навукова-даследчая работа была дэпанавана ў БелІСА.

Наступная навукова-даследчая работа кафедры вялася ў межах тэмы «Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і іх кадравага патэнцыялу: гісторыя, сучаснасць» (2000–2005 гг.). Вынікі даследавання значныя. Аўтарамі выяўлены кірункі ўдасканалення прававой базы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк, узаемаадносін паміж бібліятэкамі, выдавецтвамі, кнігагандлёвымі ўстановамі; вызначаны змены



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў арганізацыі і тэхналогіі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк; у мэтах удасканалення фарміравання фондаў бібліятэк і павышэння прафесійнай кваліфікацыі кадраў прапанаваны мадэлі прадастаўлення інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам бібліятэк і мадэлі бесперапыннай падрыхтоўкі бібліятэчных супрацоўнікаў. Вызначаны шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі кадраў публічных бібліятэк у кантэксце павышэння сацыяльнай ролі бібліятэкара ў інфармацыйным грамадстве; укаранення ў вучэбны працэс новых педагагічных тэхналогій, у тым ліку рэйтынгавай сістэмы ацэнкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў; неабходнасці павышэння камунікатыўнай культуры і камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэчнага персаналу; прадухілення канфліктаў у абслугоўванні карыстальнікаў, удасканалення стасункаў у бібліятэчным асяроддзі. Гэта дало магчымасць сфармуляваць новыя падыходы да сістэмы падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў і абгрунтаваць неабходнасць увядзення на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый новых падвоеных спецыялізацый, вывучэння пытанняў пошуку крыніц пазабюджэтнага фінансавання, укаранення новых форм супрацоўніцтва бібліятэкі з карыстальнікамі і партнёрамі ў галіне камплектавання фондаў. Былі глыбока асэнсаваны тэарэтыка-метадычныя асновы фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў публічных бібліятэк, а таксама дачыненне бібліятэчнай прафесіі да прафесій інтэгратыўнага тыпу «чалавек – знакавыя сістэмы – чалавек», што абумовіла выкарыстанне псіхасеміётыка – камунікатыўнага падыходу ў даследаванні шэрагу праблем. Прадстаўлены шляхі фарміравання бібліятэчных фондаў з улікам інфармацыйных патрэбнасцей чытачоў; нарматыўна-метадычнае забеспячэнне тэхналогіі апрацоўкі дакументаў; выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў; праведзена тэарэтычнае асэнсаванне і распрацаваны метадычныя аспекты кампенсаторнага чытання; абаснаваны функцыі і прынцыпы тыфлабібліятэказнаўства як вучэбнай дысцыпліны для ўдасканалення падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў для спецыяльных бібліятэк; раскрыта значнасць вывучэння пытанняў пазабюджэтнага фінансавання пры падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных кадраў.

Матэрыялы даследавання выкарыстаны пры выкладанні вучэбных дысцыплін: «Абслугоўванне карыстальнікаў», «Бібліятэчныя зносіны», «Бібліятэчныя фонды», «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Бібліятэчны фандрэйзінг».

Такім чынам, трэці этап развіцця кафедры можна лічыць росквітам навукова-даследчай дзейнасці. Здзейснена 5 комплексных даследаванняў, характэрных пашырэннем сферы навукова-даследчых, вучэбна-метадычных інтарэсаў.

Сярод абагульненых – наступныя напрацоўкі:

– створана сістэма і алгарытм вывучэння курсаў «Сусветная гісторыя бібліятэчнай справы», «Бібліятэчны фандрэйзінг» (дац. У.А. Акуліч);

– распрацавана тэрміналогія ў галіне бібліятэчнай справы, што адлюстравана ў перакладных і тлумачальных слоўніках (праф. Л.А. Дзямешка, у сааўт.);

– удакладнена заканадаўчая база бібліятэчнай справы (дац. Р.С. Матульскі);

– распрацавана методыка падрыхтоўкі прэзентацыйных матэрыялаў у вучэбным працэсе з дапамогай POWER POINT (дац. С.А. Паўлава);

– падрыхтавана аснова для адкрыцця пры універсітэце факультэта перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў (першы дэкан яго – дац. Н.В. Алянюк);

– пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры абаронены 4 кандыдацкія дысертацыі (нав. кір. – Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, Н.А. Ляйко);

– абаронена першая доктарская дысертацыя «Бібліятэка як сацыяльны інстытут: тэарэтыка-метадалагічны аспект» (дац. Р.С. Матульскі) [9].

Бібліятэказнаўчая дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь адлюстравана ў грунтоўнай «Бібліятэчнай энцыклапедыі», выдадзенай у Маскве [10].

Чацвёрты этап развіцця кафедры адзначаецца рэарганізацыяй факультэта (2003 г.). Кафедра бібліятэказнаўства перайменавана ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, а бібліятэчны факультэт – у факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Набыццё новай назвы і статуса кафедры з'явілася адэкватнай рэакцыяй на новыя сацыяльна-культурныя парадыгмы развіцця бібліятэчнай справы, бягучыя патрэбнасці айчыннай бібліятэчнай практыкі, звязаныя з неабходнасцю падрыхтоўкі спецыялістаў, што валодаюць грунтоўнымі ведамі ў сферы менеджменту бібліятэчнай справы.

Выкладчыкамі распрацавана сістэмная канцэпцыя базавай упраўленчай падрыхтоўкі студэнтаў адпаведнай кваліфікацыі з уключэннем цыклу інавацыйных курсаў; прадугледжаны спецыяльныя курсы (дысцыпліны, спецыялізацыі). Фундаментальная частка профільнай упраўленчай падрыхтоўкі рэалізуецца праз распрацоўку і выкладанне новых дысцыплін «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Інфармацыйны рынак», «Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент», «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент», «Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк», «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк», «Бібліятэчная статыстыка», «Бібліятэчны файндрэйзінг», «Паблік-рылэйшнз і бібліятэчная рэклама», «Псіхалогія кіравання», «Кіраванне персаналам бібліятэкі» і інш.

У сувязі з гэтым пэўныя здабыткі ў галіне навукова-даследчай дзейнасці былі выкарыстаны пры выданні вучэбных дапаможнікаў новага пакалення, якім прысвечаны грыф Міністэрства адукацыі [11].

Значна пашырыць кола нацыянальных выданняў нашай краіны і запоўніць істотны прабел у недахопе вучэбных і метадычных матэрыялаў, падрыхтаваных на падставе беларусазнаўчай тэматыкі для спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, дазваляе ўдзел выкладчыкаў у рэалізацыі праекта «Прафесіяналам бібліятэчнай справы», ініцыіраванага бібліятэкай БДУ культуры і мастацтваў і выдавецтвам «Новое знание». У 2008–2009 г. выйшлі з друку навукова-практычныя дапаможнікі «Правовое обеспечение деятельности библиотек Республики Беларусь» (выкл. Ю.М. Галкоўская), «Менеджмент школьной библиотеки» (прафесар Л.А. Дзямешка), «Формирование кадровых ресурсов библиотек в новой информационной среде» (аспірантка І.Б. Стралкова). У друку знаходзяцца: «Падрыхтоўка бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэкамі» (дацэнт С.В. Зыгмантовіч), «Бібліятэчныя зносіны» (дацэнт Н.У. Клімянкова), «Бібліятэчная сацыяномія» (дацэнт Н.Я. Петушка), «Бібліятэчны файндрэйзінг» (ст. выкл. Ю.А. Пераверзева), «Бібліятэка і экалогія: пытанні выхавання падлеткаў» (аспірантка В.А. Какшынская).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтыя прыклады яскрава сведчаць аб ролі выкладчыкаў у развіцці айчыннага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, аб інтэграцыйных працэсах у навуковай, вучэбнай і практычнай дзейнасці.

Кафедра працягвае распрацоўку комплексных навукова-даследчых тэм. У 2006 г. пасля паспяхова завершанай папярэдняй тэмы на Савеце універсітэта зацверджана чарговая кафедральная тэма «Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне», над якой працуюць члены кафедры, аспіранты, магістранты, суіскальнікі, студэнты.

Уклад у развіццё галіновай навукі кафедра ўносіць і шляхам падрыхтоўкі навуковых кадраў – магістрантаў і аспірантаў. З 2003 г. падрыхтавана 14 магістрантаў, у аспірантуры навучаецца 5 аспірантаў і 1 суіскальнік. Тэматыка навуковых даследаванняў магістрантаў і аспірантаў звязана з актуальнымі праблемамі: фарміраваннем кадравага патэнцыялу вузаўскіх бібліятэк краіны (асп. І.Б. Стралкова), пытаннямі адаптацыі маладых спецыялістаў для работы ў бібліятэках (суіск. І.В. Юрык), фарміраваннем камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкараў (асп. Л.І. Манукян), экалагічным выхаваннем чытачоў-падлеткаў (асп. В.А. Какшынская), падрыхтоўкай і выкарыстаннем у краіне біябібліяграфічнай інфармацыі (асп. А.Ю. Казленка), работай бібліятэк па развіцці чытацкай дзейнасці падлеткаў (асп. І.А Марозава), работай ПЦПІ па фарміраванні прававой культуры насельніцтва (магістрантка І.А Чупракова) і інш.

Шмат увагі надаецца фарміраванню навыкаў навуковай работы студэнтаў: навуковай працай ахоплена больш за 130 студэнтаў дзённай і завочнай формы навучання, штогод каля 30 дакладаў прадстаўляюць студэнты на студэнцкія навуковыя канферэнцыі універсітэта, іншых навучальных устаноў краіны. Аб эфектыўнасці гэтай работы сведчаць вынікі штогадовага Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў, на які за апошнія 5 гадоў было прадстаўлена 50 работ, з іх 15 (30%) атрымалі дыплом першай катэгорыі, астатнія – дыпломы другой і трэцяй катэгорый.

На дадзены момант у планах кафедры – комплексная распрацоўка пытанняў бібліятэчнай педагогікі, фарміраванне навуковай школы ў межах гэтага напрамку, падрыхтоўка вучэбных, практычных выданняў як для студэнтаў, так і для бібліятэчных спецыялістаў краіны.

ЛІТАРАТУРА

**Симановский, И.Б.** Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И.Б. Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР. – М.: Гос. б-ка СССР им. В.И. Ленина, 1958. – С. 191–286.

**Покало, М.И.** Библиотечные фонды Белорусской ССР / М.И. Покало. – Мн.: Выш. школа, 1972. – 84 с.; **Покало, М.И.** История библиотечного дела в БССР / М.И. Покало. – Мн.: Выш. школа, 1986. – 198 с.

**Акулич, В.А.** Библиотечное строительство в Белорусской ССР (1966 – 1975 гг.) / В.А. Акулич // Работа библиотек Белорусской ССР по коммунистическому воспитанию трудящихся в период развитого социализма (1966–1975 гг.): автореф. канд. дис. ... ист. Наук. – Мн., 1982. – 18 с.; **Емец, И.П.** Роль библиотек Белорусской ССР в социалистическом строительстве (1926–1937 гг.): автореф. канд. дис. ... пед. наук / И.П. Емец. – Мн., 1981. – 17 с.; **Козловская, Л.И.** Борьба рабочей молодежи Белоруссии за развитие промышленности в годы пятой пятилетки (1951–1955 гг.): автореф. канд. дис. ... наук / Л.И. Козловская. – Мн., 1978. – 26 с.; **Латотина, Т.Т.** Деятельность коммунистической партии Белоруссии по развитию библиотечного дела в республике (1959–1965 гг.): автореф. канд. дис. ... наук / Т.Т. Латотина. – Мн., 1977. – 21 с.; **Лейко, Н.А.** Повышение роли технических библиотек Белоруссии по ускорению научно-технического прогресса в промышленности (1961–1970 гг.): автореф. канд. дис. ... ист. наук / Н.А. Лейко. – Л., 1981. – 19 с.

**Демешко, Л.А.** Пути совершенствования работы массовых библиотек по интернациональному воспитанию рабочей молодежи (на материале БССР): автореф. канд. дис. ... пед. наук / Л.А. Демешко. – Мн., 1978. – 18 с.; **Дукель, В.А.** Педагогические основы влияния открытого доступа к фондам библиотек на формирование читательских интересов: автореф. канд. дис. ... наук / В.А. Дукель. – Мн., 1979. – 19 с.; **Клименкова, Н.В.** Руководство самообразовательным чтением в централизованной библиотечной системе (на примере ЦБС Белорусской ССР): автореф. канд. дис. ... пед. наук – М., 1983. – 20 с.; **Павлова, С.А.** Книга и чтение в жизни партизан Белоруссии: автореф. канд. дис. ... фил. наук / С.А. Павлова. – Л., 1983. – 18 с.

**Олянюк, Н.В.** Подготовка и повышение квалификации библиотечных кадров в БССР: история, современное состояние и перспективы: автореф. канд. дис. ... пед. наук / Н.В. Олянюк. – М., 1991. – 16 с.

**Мотульский, Р.С.** Библиотечная статистика: современное состояние и пути совершенствования: автореф. канд. дис. ... пед. наук / Р.С. Мотульский. – М., 1991. – 16 с.

**Леончиков, В.Е.** Русско-белорусский словарь библиотечных и библиографических терминов / В.Е. Леончиков, Л.А. Демешко. – Мн., Выш. школа, 1992. – 131 с.; **Лявончыкаў, В.Е.** Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е. Лявончыкаў, Л.А. Дзямешка, Р.І. Саматыя. – Мн., Бел. ун-т культуры, 2000. – 225 с.; **Лявончыкаў, В.Е.** Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е. Лявончыкаў, Л.А. Дзямешка, Р.І. Саматыя. – 2-е выд. – Мн., Бел. ун-т культуры, 2003. – 223 с.

**Ksiazka I czytelnik w grupach etnicznych.** – Warszawa, 1991. – S. 91–129.

**Мотульский, Р.С.** Библиотека как социальный институт: теоретико-методологический аспект: автореф. докт. дис. ... пед. наук / Р.С. Мотульский. – Мн., 2002. – 45 с.

**Акулич, В.А.** Белоруссия: библиотечное дело / В.А. Акулич, Н.В. Клименкова // Библиотечная энциклопедия. – Москва, 2007. – С. 80–81.

**Зыгмантовіч, С.В.** Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці / С.В. Зыгмантовіч. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.; **Зыгмантовіч, С.В.** Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэк / С.В. Зыгмантовіч. – Мн., БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 150 с.; **Дзямешка, Л.А.** Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк / Л.А. Дзямешка, С.А. Паўлава. – Мн.: БДУ , культуры і мастацтваў, 2007. – 110 с.; **Паўлава, С.А.** Уводзіны ў спецыяльнасць: метад. дап. / С.А. Паўлава. – Мн. БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 55 с.; **Пераверзева, Ю.А.** Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вуч.-метад. дап. / Ю.А. Пераверзева. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 113 с.

**Summary**

In the article the authors describe the study of librarianship and library science issues, analyze the importance of libraries for social development and vice versa.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ